ДЗЯРЖАКТЫВЫ ПАД КАНТРОЛЕМ
На эканамічным факультэце новая спецыяльнасць – «дзяржаўны аўдыт»
Стар. 3

ЗАХАВАЛЬНІКІ НАШАЙ СПАДЧЫНЫ
Распавядаем пра тых, хто збірае і захоўвае ў БДУ кніжныя помнікі і беларускі фальклор
Стар. 4–5

ЗА «ПАРТАЙ» У ПРАФЕСАРА ХОДЗІНА
Інтэрв'ю з вучнямі юбіляра – доктара гістарычных навук С. М. Ходзіна
Стар. 6

У БЕЛАРУСІ – ЯК ДОМА?
Пра вопыт навучання і жыццё ў краіне распавядаюць замежныя студэнты БДУ
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

23 мая 2023 года, № 5 (2270)

БДУ і Куба: новыя вектары супрацоўніцтва

Дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам Андрэем КАРАЛЁМ наведала Кубу з 17 па 22 красавіка. Вынікам візіту стаў падпісаны пакет дакументаў пра адукацыйна-навуковае супрацоўніцтва з кубінскімі ВНУ.



Сёння БДУ мае чатыры доўгатэрміновыя дамовы з кубінскімі ўстановамі. Адной з іх з'яўляецца дамова з Гаванскім універсітэтам – вядучым і найстарэйшым у сваёй краіне (заснаваны ў 1728 годзе).

Старт афіцыйнай праграме дала сустрэча з намеснікам міністра вышэйшай адукацыі Кубы **Рэінальда Веласкесам Салдыварам**. У абмеркаванні пытанняў актывізацыі міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва таксама прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Куба **Валерый Бараноўскі**. Бакі абмяняліся перспектыўнымі прапановамі па ўмацаванні адукацыйна-навуковых сувязяў.

Першыя перамовы з кубінскімі партнёрамі прайшлі ў Гаванскім універсітэце (ГУ). Бакі выказалі ўзаемную цікавасць у актуалізацыі наяўных дамоўленасцяў па лініі адукацыі і навукі. Былі вызначаны канкрэтныя сферы і формы партнёрства, разгледжаны перспектывы дыстанцыйнага ўзаемадзеяння і асаблівасці беларускай і кубінскай сістэм вышэйшай адукацыі. Вынікам сустрэчы стала падпісанне Праграмы супрацоўніцтва паміж ВНУ. Дакумент дэталёва прапісвае сумесную працу ў галіне біялогіі, геаграфіі, хіміі, матэматыкі, турызму, вывучэння іспанскай і рускай моў. Акадэмічная мабільнасць, арганізацыя стажыровак, гасцявых лекцый, правядзенне навуковых даследаванняў, а таксама сумесная падрыхтоўка спецыялістаў будуць хуткім часам рэалізаваны ВНУ.

Першым крокам да вызначаных планаў стаў завераны подпісамі рэктараў БДУ і ГУ Мемарандум аб намерах распрацоўкі сумесных адукацыйных праграм (САП). Універсітэты ўмовіліся падрыхтаваць з перспектывай выдачы двайных дыпломаў САП магістратуры ў сферы біялогіі, матэматыкі, хіміі, геаграфіі, турызму і замежных моў.

Супрацоўніцтва ў галіне педагогікі будуць развіваць БДУ і Педагагічны ўніверсітэт Энрыке Хасэ Варона. Гэта ВНУ заснавана ў 1977 годзе і носіць імя выбітнага педагога і інтэлектуала, міністра фінансаў, міністра дзяржаўнай адукацыі і вытанчаных мастацтваў Кубы, які сваімі ідэямі, палітычнай, філасофскай і педагагічнай дзейнасцю зрабіў значны ўнёсак у фарміраванне кубінскай нацыі.

Падчас сустрэчы дэлегацыі БДУ і рэктара **Мілды Лесбія Дыяз Масіп** адбылася прадметная гутарка па вызначэнні вектараў узаемадзеяння з улікам профілю кубінскай ВНУ. Узаемную цікавасць выклікаў досвед бакоў у галіне прафесійнай педагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў з укараненнем інавацыйных методык у навучальны працэс.

Важным крокам для замацавання разгледжаных у рамках візіту перспектыў стала падпісанне дамовы аб супрацоўніцтве. Дакумент рэгламентуе абмен студэнтамі, магістрантамі, запрашэнне выкладчыкаў і даследчыкаў для сумеснай працы над навукова-даследчымі і адукацыйнымі праектамі. Ён прадугледжвае абмен інфармацыяй, навучальнымі матэрыяламі, сумеснае правядзенне навукова-адукацыйных мерапрыемстваў і падрыхтоўку публікацый. Таксама бакі выказалі намер аб распрацоўцы сумесных адукацыйных праграм у галіне гуманітарных навук з выдачай двух дыпломаў. Афіцыйны статус гэтым планам надаў зацверджаны бакамі мемарандум паміж БДУ і Педагагічным універсітэтам Энрыке Хасэ Варона.

За тэматычным круглым сталом «Інавацыйныя методыкі выкладання ва ўніверсітэцкай адукацыі» дэталёва былі разгледжаны і прааналізаваны сучасныя тэндэнцыі крэатыўнага навучання, прадстаўлены досвед БДУ ў гэтай галіне. Як адзначыў рэктар **Андрэй Кароль**, для рэалізацыі дадзенай сістэмы важна развіваць эўрыстычныя якасці ў першую чаргу самога выкладчыка.

У працяг заяўленай тэматыкі рэктар БДУ выступіў з адкрытай лекцыяй «Навошта і дзе шукаць чалавека ў адукацыі: дыялог паміж Захадам і Усходам» перад студэнтамі і выкладчыкамі Педагагічнага ўніверсітэта.

Падчас сустрэчы з кіраўніцтвам міністэрстваў замежных спраў і замежнага гандлю і замежных інвестыцый Кубы былі разгледжаны актуальныя праблемы замежнай палітыкі дзвюх краін. Была адзначана важнасць абмену наяўным досведам у падрыхтоўцы спецыялістаў для міжнароднай сферы, развіцця супрацоўніцтва ў сферы сумеснай вытворчасці і падрыхтоўкі спецыялістаў у запатрабаваных сёння галінах IT, біятэхналогій і інш.

Пра распрацоўку, перадачу і адаптацыю тэхналогій вытворчасці лекаў рознага прызначэння, правядзенне сумесных даследаванняў па стварэнні новых медыцынскіх прэпаратаў гаворка ішла падчас наведвання дэлегацыяй БДУ фармацэўтычных кампаній Кубы. Бакі абмеркавалі магчымасць пастаўкі ў гэту краіну інавацыйных прэпаратаў для лячэння розных паталогій, уключаючы лакальную хіміятэрапію раку галаўнога мозгу, галавы, шыі, а таксама фармацэўтычных субстанцый для вытворчасці супрацьпухлінных і кардыятропных лекавых прэпаратаў.

Акрамя таго, дэлегацыя БДУ правяла шэраг сустрэч з прадстаўнікамі батанічных садоў у гарадах Гавана і Сьенфуэгас. Бакі абмяняліся прапановамі па навуковым супрацоўніцтве ў галіне захавання біяразнастайнасці. Вялікія перспектывы бачацца ў правядзенні сумесных даследаванняў па сістэматыцы, экафізіялогіі і біяхіміі абарыгенных і інтрадукаваных раслін. Абмяркоўвалася таксама магчымасць абмену калекцыямі ўнікальных раслін, гербарным і пасадкавым матэрыялам з улікам нацыянальных і міжнародных нормаў. Акрамя таго, ёсць верагоднасць правядзення сумесных экспедыцыйных даследаванняў, арганізацыі навуковых стажыровак супрацоўнікаў устаноў і падрыхтоўкі сумесных публікацый у галіне біялогіі, фізіялогіі і біятэхналогіі раслін.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
23 мая 2023 года, № 5 (2270)

Забыццю не падлягае

4 мая ва ўнутраным дворыку ўніверсітэта прайшло мерапрыемства ў гонар Дня Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Супрацоўнікі і навучэнцы БДУ ўшанавалі памяць ахвяр вайны хвілінай маўчання.

Першы прарэктар БДУ Дзмітрый КУРЛОВІЧ павіншаваў прысутных з надыходзячым Днём Перамогі і адзначыў важнасць захавання памяці пра гэту гістарычную падзею:

– Для мяне гэтае свята і сумнае, і радаснае. Чатыры кровапралітныя гады наша краіна змагалася ў той вайне і змагла вызваліцца ад акупацыі, але загінула вельмі шмат людзей. У гэты дзень сумна і таму, што нашы саюзнікі, вызваленыя краіны, перапісалі ход гісторыі. І цяпер яны стаяць ля нашых межаў, пагражаючы новай вайной.

Кіраўніцтва ўніверсітэта, запрошаныя госці, выкладчыкі і студэнты пад удары званоў усклалі кветкі да «Стэлы памяці». Прыемна, што і ў гэтым годзе на ўрачыстым мерапрыемстве прысутнічаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, былы супрацоўнік факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ дацэнт Фёдар Фешчанка.

Штогод БДУ шануе памяць тых, хто пакінуў працу, вучобу і пайшоў на фронт – абараняць Радзіму. У Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнічалі больш за тысячу супрацоўнікаў і навучэнцаў універсітэта – толькі ў першыя дні амаль 450 чалавек добраахвотна сышлі на фронт. Частка калектыву паспела эвакуявацца, а большасць з тых, хто застаўся ў Мінску, сталі актыўнымі ўдзельнікамі падпольнага і партызанскага руху.

12 прадстаўнікам БДУ, якія сышлі на фронт у гады Вялікай Айчыннай вайны, прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза

На святочнай тэматычнай экспазіцыі была выстаўлена ваенная тэхніка 1940-х гадоў, арганізаваны інсталяцыя «Алея герояў Вялікай Айчыннай вайны» і фотазона. Суправаджалася мерапрыемства кампазіцыямі ў выкананні харавой капэлы БДУ і сольнымі выступленнямі студэнтаў. Падчас мітынгу-рэквіему «Забыццю не падлягае» некаторыя гледачы ўпотай выціралі слёзы.

Пад акампанемент духавога аркестра МНС уздоўж «Алеі герояў» прайшлі ўрачыстым маршам курсанты ваеннага факультэта БДУ. Студэнты ўніверсітэта падрыхтавалі канцэртную праграму «Песні нашай перамогі». На тэматычнай пляцоўцы «Салдацкі прывал» курсанты частавалі гасцей сапраўднай салдацкай кашай.

У гонар Дня Перамогі з 4 па 12 мая ў холе рэктарата працавала выстава «Захоўвайце памяць пакаленняў!» музея гісторыі БДУ. У экспазіцыю ўвайшлі фатаграфіі, дакументы, лісты з фронту і кнігі, якія дапамаглі ўзнавіць атмасферу ваенных гадоў.

Дэлегацыя студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ на чале з першым прарэктарам далучылася 9 мая да святочных акцый на розных гарадскіх пляцоўках Мінска.

У парку імя М. Паўлава падчас раённага свята, прысвечанага 78-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, былі арганізаваны інтэрактыўныя зоны БДУ. Адна з такіх – выстава экспанатаў этналагічнага музея гістарычнага факультэта. У канцэртнай праграме «Песні міру на вайне», якая праходзіла на Плошчы Перамогі, з тэматычнымі нумарамі выступіў заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца БДУ «Крыжачок».

Ілья ВАРАБ'ЁЎ

БДУ актывізуе супрацоўніцтва з ВНУ Зімбабвэ

Гэта пытанне стала ключавым падчас сустрэчы рэктара Андрэя Караля з міністрам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, навукі і тэхналагічнага развіцця Рэспублікі Зімбабвэ Амонам Мурвіра. Абмеркаванне адбылося 16 мая ў рамках афіцыйнага візіту дэлегацыі кіраўнікоў зімбабвійскіх устаноў адукацыі і арганізацый у БДУ.

Галоўнай мэтай наведвання Беларусі і ў прыватнасці БДУ міністр назваў умацаванне наяўных дамоўленасцяў, напаўненне іх прадметным зместам і развіццё новых напрамкаў супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі, тэхналогій і інавацый. Амон Мурвіра выказаў гатоўнасць пашырыць лінейку наяўных дамоў з БДУ, каб далучыць да іх рэалізацыі большую колькасць зімбабвійскіх ВНУ.

Бакі абмяняліся перспектыўнымі прапановамі па прадметным напаўненні наяўных дамоў і развіцці двухбаковага супрацоўніцтва з іншымі ВНУ Зімбабвэ. Прагучалі ініцыятывы пра ўзаемадзеянне ў галіне экалогіі, глебазнаўства, біялогіі. Была разгледжана магчымасць распрацоўкі сучасных лічбавых тэхналогій, геаінфармацыйных сістэм, глебаахоўных мерапрыемстваў і тэхналогій на землях, схільных да эразійных працэсаў.

Сур'ёзным крокам да трывалага супрацоўніцтва можа стаць адкрыццё ў Зімбабвэ Навучальнага цэнтра дыстанцыйнага навучання БДУ. Рэалізацыя дадзенага намеру дазволіць навучыць студэнтаў Зімбабвэ рускай мове і падрыхтаваць да паступлення ў беларускія ўніверсітэты.

Вынікам перамоў стала падпісанне шэрагу дакументаў пра супрацоўніцтва паміж БДУ і ВНУ Зімбабвэ. Дамова пра супрацоўніцтва з Тэхналагічным інстытутам Харарэ і Мемарандум аб паразуменні з Дзяржаўным універсітэтам Мідлендса дазволяць развіваць акадэмічныя абмены, праводзіць фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні, сумесныя навуковыя канферэнцыі, выставы, форумы, сімпозіумы, семінары і інш.

Працягнулася знаёмства гасцей з інтэлектуальным патэнцыялам БДУ на выставе навуковых распрацовак. Тут былі прадстаўлены нанаспадарожнік BSUSat-2, супрацьпухлінныя лекавыя прэпараты «Тэмадэкс», «Праспідэлонг», «Цысплацел» для лакальнай хіміятэрапіі, ветэрынарныя біяпрэпараты для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых і хатніх жывёл, мікробныя біяпрэпараты для раслін «МаксІмун», «Бактаген», «Немацыд», «Стымул» і інш.

Праграма візіту наведвання БДУ ўключала таксама сустрэчу Амона Мурвіра са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ. Міністр Зімбабвэ выступіў з лекцыяй і распавёў пра развіццё адукацыі і навуковы патэнцыял афрыканскай дзяржавы. Сваімі ўражаннямі пра беларускі ўніверсітэт, а таксама пажаданнямі па ўмацаванні партнёрскіх адносін паміж краінамі Амон Мурвіра падзяліўся ў кнізе ганаровых гасцей БДУ.

Важнай падзеяй гэтага дня стала падвядзенне вынікаў на базе БДУ двухтыднёвага візіту дэлегацыі Зімбабвэ ў Беларусь. Кіраўнікі двух профільных міністэрстваў Андрэй Іванец і Амон Мурвіра прынялі ўдзел у цырымоніі падпісання пакета дакументаў пра супрацоўніцтва паміж ВНУ Беларусі і Зімбабвэ. Усяго на пляцоўках БДУ было заверана 20 дакументаў, якія прадугледжваюць узаемадзеянне паміж МДЛУ, БДЭУ, БДМУ, БДУТ, Беларуска-расійскім універсітэтам, ГрДУ імя Янкі Купалы, ПалесДУ, БДАТУ, ПДУ імя Ефрасінні Полацкай і Тэхналагічным інстытутам Харарэ, Дзяржаўным універсітэтам Мідлендса, Універсітэтам Зімбабвэ, Дзяржаўным універсітэтам Лупанэ, Тэхналагічным універсітэтам Чынхоі, Політэхнічным каледжам Харарэ.

Нагадаем, сёння БДУ супрацоўнічае з Зімбабвэ ў рамках падпісанага ў 2019 годзе Мемарандума аб дамоўленасці з Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, навукі і тэхналагічнага развіцця Зімбабвэ. У лютым цяперашняга года дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём прыняла ўдзел у другім беларуска-зімбабвійскім бізнес-форуме «Пашыраючы гарызонты: дынамічныя рашэнні эканамічнага развіцця», а таксама шэрагу мерапрыемстваў па лініі адукацыі і навукі. Вынікам візіту для БДУ стала падпісанне шасці мемарандумаў аб паразуменні.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Дзяржаўны аўдыт – від прафесійнай дзейнасці, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці кіравання нацыянальнымі рэсурсамі, найважнейшымі з якіх з'яўляюцца дзяржаўныя фінансы, уласнасць, прыродныя багацці і інтэлектуальны капітал.

Дзяржаўныя актывы пад кантролем

З наступнага навучальнага года на эканамічным факультэце БДУ з'явіцца новая спецыяльнасць «дзяржаўны аўдыт». Плануецца, што 60% месцаў будуць мэтавымі.

У Рэспубліцы Беларусь цэнтральным звяном сістэмы кантролю выкарыстання дзяржаўнай маёмасці і бюджэтных сродкаў з'яўляецца Камітэт дзяржаўнага кантролю. Адкрыццё новай спецыяльнасці спрыяе нарошчванню неабходнага для эканомікі краіны кадравага запасу – спецыялістаў, здольных прафесійна ажыццяўляць кантроль за эфектыўным і рацыянальным выкарыстаннем бюджэтных сродкаў і дзяржаўнай уласнасці.

Аднак такі аўдыт не зводзіцца выключна да праверкі фінансавай справаздачнасці дзяржаўных структур. Яго асноўная задача – забеспячыць дзейнасць органаў улады па кіраванні даручанымі ім грамадскімі рэсурсамі, напрыклад, па кіраванні дзяржаўнымі фінансамі і мясцовымі бюджэтамі. Таксама сярод задач аўдытара ацэнка (напрыклад, выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, ажыццяўлення дзяржаўных закупак), аналіз узроўню эканамічнай бяспекі і забеспячэнне эканамічнай бяспекі.

– Наша новая спецыяльнасць адносіцца да групы «эканамічная бяспека», у рамках якой мы навучаем студэнтаў прафесійна вырашаць задачы па забеспячэнні эканамічнай бяспекі: выяўляць знешнія і ўнутраныя пагрозы, прымяняць прылады і механізмы нейтралізацыі і прадухілення пагроз, абароны эканамічных інтарэсаў арганізацый розных формаў уласнасці, – распавядае дэкан эканамічнага факультэта **Ганна Анатольеўна Каралёва**.

Акцэнт у падрыхтоўцы спецыяліста па дзяржаўным аўдыце зроблены на дысцыпліны, звязаныя з вывучэннем бухгалтарскага ўліку ў арганізацыі і асаблівасцямі яго прымянення ў розных сферах дзейнасці. Працэс навучання арыентаваны пераважна на атрыманне ведаў у галіне правядзення незалежнай аўдытарскай праверкі па пацвярджэнні дакладнасці бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці гаспадарчых суб'ектаў і адпаведнасці заканадаўству здзейсненых гаспадарчых аперацый. Таксама запланавана вывучэнне студэнтамі спецыяльных дысцыплін у галіне дзяржаўных фінансаў і дзяржаўнай эканамічнай палітыкі, кантролю эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, асаблівасцяў правядзення аўдыту дзяржаўных рэсурсаў.

– Падрыхтоўку такіх кваліфікаваных работнікаў немагчыма забяспечыць у рамках ужо існых спецыяльнасцяў у вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Трэба дадаць у праграму падрыхтоўкі шмат дысцыплін, якія тычацца менавіта дзяржаўных фінансаў і дзяржаўнага кіравання ў цэлым, – тлумачыць Ганна Каралёва. – Спецыялісту па дзяржаўным аўдыце неабходныя веды не толькі методыкі правядзення аўдыту, але і бюджэтных працэдур, асноў эканамічнай палітыкі, эканамічнай бяспекі, асаблівасцяў кіравання дзяржуласнасцю, а таксама ўменне папярэджваць неэфектыўнае выкарыстанне бюджэтных фінансаў і дзяржаўнай уласнасці эканоміка-прававымі метадамі. Акрамя таго, ва ўмовах нарастання глабальных выклікаў і пагроз трэба рыхтаваць спецыялістаў, якія здольныя прымаць кіраўнічыя рашэнні па забеспячэнні эканамічнай бяспекі як на рэгіянальным узроўні, так і на ўзроўні суб'ектаў гаспадарання. Таму будучая спецыяльнасць прадугледжвае падрыхтоўку выпускнікоў, здольных праводзіць маніторынг і аўдыт кіравання нацыянальнымі рэсурсамі на дзяржаўным, рэгіянальным узроўнях, а таксама на ўзроўні арганізацый. І перш за ўсё забяспечваць іх эканамічную бяспеку.

Што будуць вывучаць студэнты

Навучальны план распрацаваны на аснове планаў спецыяльнасцяў «Эканоміка», «Фінансы і крэдыт» і «Эканамічная бяспека». Акрамя стандартнага дзяржаўнага кампанента студэнты будуць вывучаць такія эканамічныя дысцыпліны, як «Кантроль і рэвізія», «Асновы дзяржаўнага аўдыту», «Бюджэтная сістэма», «Бюджэтна-падатковая палітыка», «Асновы эканамічнай бяспекі», «Падатковае стымуляванне эканамічнай дзейнасці», «Міжнародныя стандарты аўдыту», «Кіраванне дзяржаўнымі закупкамі», «Аналіз эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў», «Грамадзянскае права» і іншыя. У праграму спецыяльнасці будуць уключаны сучасныя метады аналітыкі вялікіх даных, штучнага інтэлекту, воблачных тэхналогій.

– 53% прафесарска-выкладчыцкага складу эканамічнага факультэта БДУ маюць ступень кандыдата навук і 12% – доктара навук, што забяспечыць высокі ўзровень падрыхтоўкі будучых аўдытараў. Мы будзем узаемадзейнічаць з прадстаўнікамі замоўцаў кадраў, у тым ліку органамі дзяржаўнага кіравання. У нас ёсць папярэднія дамоўленасці пра чытанне лекцый і правядзенне практычных заняткаў з Камітэтам дзяржаўнага кантролю, Міністэрствам фінансаў, Міністэрствам па падатках і зборах, Аўдытарскай палатай. У планах сумесная падрыхтоўка студэнтаў з Вышэйшай школай дзяржаўнага аўдыту Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, – адзначае Ганна Каралёва.

Дзе выпускнікі змогуць пабудаваць кар'еру

У выпускнікоў шырокія перспектывы па працаўладкаванні. У першую чаргу гэта органы дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь: Камітэт дзяржаўнага кантролю, Міністэрства па падатках і зборах, Міністэрства фінансаў, абласныя і гарадскія выканаўчыя камітэты і інш. Таксама спецыялісты змогуць уладкавацца ў навукова-даследчыя ці камерцыйныя арганізацыі, установы адукацыі.

З тым наборам навыкаў і ведаў, якія атрымаюць выпускнікі новай спецыяльнасці, яны змогуць працаваць у службах эканамічнай бяспекі, кантрольных і аналітычных службах бюджэтных і камерцыйных арганізацый, аддзелах унутранага аўдыту і ведамаснага кантролю дзяржаўных органаў. Акрамя таго, змогуць стаць спецыялістамі ў галіне выканання бюджэту, кіравання бюджэтна-падатковай сферай, рэгулявання эфектыўнага вядзення эканамічнай дзейнасці. Для іх таксама адкрытыя кар'ерныя магчымасці ў кіраванні сацыяльнымі праграмамі.

Ганна КАЗАКОВА

Візітоўка спецыяльнасці «дзяржаўны аўдыт»

Выпускнікі дадзенай спецыяльнасці атрымаюць неабходныя веды і навыкі, каб прафесійна вырашаць задачы па кантролі за эфектыўным і рацыянальным выкарыстаннем бюджэтных сродкаў і дзяржаўнай уласнасці.

План прыёму на 2023/2024 навучальны год: 25 бюджэтных месцаў.

Форма навучання: вочная (дзённая).

Кваліфікацыя: эканаміст, спецыяліст па аўдыце.

Тэрмін навучання: 4 гады.

Уступныя іспыты: беларуская/руская мова (ЦЭ), матэматыка (ЦЭ/ЦТ), замежная мова (ЦЭ/ЦТ).

Студэнты будуць вывучаць: кантроль і рэвізію, асновы дзяржаўнага аўдыту, бюджэтную сістэму, бюджэтна-падатковую палітыку, асновы эканамічнай бяспекі, падатковае стымуляванне эканамічнай дзейнасці, міжнародныя стандарты аўдыту, кіраванне дзяржаўнымі закупкамі, аналіз эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў, грамадзянскае права і інш.

Выпускнікі змогуць працаваць у службах эканамічнай бяспекі; кантрольных і аналітычных службах бюджэтных і камерцыйных арганізацый; аддзелах унутранага аўдыту і ведамаснага кантролю дзяржаўных органаў і інш.

СТУДЭНЦКІЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

Старшынёй Студэнцкага савета БДУ стаў трэцякурснік механіка-матэматычнага факультэта Уладзіслаў РОСЛІКАЎ.

Яго кандыдатура была зацверджана 13 красавіка ў рамках сходу Студэнцкага савета БДУ. Нагадаем, што Студэнцкі савет БДУ быў створаны ў мінулым годзе шляхам рэарганізацыі студэнцкай асамблеі. Гэта найвышэйшы калегіяльны прадстаўнічы і пастаянна дзейны орган студэнцкага сумеснага кіравання. Ён з'яўляецца прамым пасрэднікам паміж студэнцтвам і адміністрацыяй ВНУ.

Са справаздачай пра дзейнасць арганізацыі за перыяд са жніўня 2022 па сакавік 2023 года выступіла экс-старшыня чацвёртакурсніца ФМА Аліна Рацькова, а Уладзіслаў Рослікаў прадставіў праграму па развіцці студэнцкага савета: працяг правядзення форуму «М.І.Р.» і форуму студэнцкіх ініцыятыў, запуск новых праектаў (выязны форум студактыву, фотавыставы і інш.), пашырэнне супрацоўніцтва з універсітэтамі Беларусі і іншых краін СНД.

Даведка:

Уладзіслаў Рослікаў з 2020 года вучыцца на спецыяльнасці «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Займае пасаду старшыні цэхавай прафсаюзнай арганізацыі ММФ БДУ, а таксама з 2022 – старшыні студэнцкага савета факультэта.

Прымае ўдзел у дыялогавых пляцоўках, абмеркаваннях. З'яўляўся арганізатарам форуму студэнцкіх ініцыятыў, «Масленкі», кірмашу вакансій. Узнагароджаны граматай рэктара БДУ да 101-годдзя ўніверсітэта, а таксама мае ўзнагароды ад пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ.

Новым сакратаром пярвічнай арганізацыі БРСМ БДУ абраны трэцякурснік юрыдычнага факультэта Аляксей ПІКУС.

Выбары адбыліся 20 красавіка ў рамках пашыранага пасяджэння камітэта арганізацыі. Аляксей Пікус змяніў на гэтай пасадзе аспіранта філалагічнага факультэта Міхаіла Дзегцярэнку, які ўзначальваў арганізацыю на працягу пяці гадоў. На дадзены момант пярвічка БРСМ БДУ працуе па дзевяці напрамках: культурна-масавы, інфармацыйны і спартыўны, забеспячэнне другаснай занятасці студэнтаў, добраахвотніцкая праца, фандрэйзінг, сектар уліку членаў БРСМ, напрамак аховы правапарадку і служба дакументацыйнага забеспячэння. Членамі арганізацыі з'яўляюцца каля 10 тысяч студэнтаў.

Даведка:

Аляксей Пікус з 2020 года вучыцца на спецыяльнасці «правазнаўства» юрыдычнага факультэта БДУ. З'яўляецца арганізатарам і ўдзельнікам шматлікіх грамадска значных мерапрыемстваў універсітэцкага, гарадскога і рэспубліканскага ўзроўню. Займаецца добраахвотніцкай дзейнасцю. Мае падзякі міністра абароны і міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі, рэктара БДУ, а таксама медалі ад Беларускага саюза афіцэраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і нагрудны знак Міністэрства абароны Беларусі.

Новым старшынёй студэнцкага савета па якасці адукацыі і навукі БДУ стала Аляксандра ГАРБАЧЫК.

Выбары прайшлі ў рамках справаздачна-выбарнага сходу арганізацыі. Раней савет узначальвала Аліна Рацькова. Падчас пасяджэння ёй выказалі падзяку за вялікі ўклад у развіццё савета. Таксама былі ўручаны падзякі за добрасумленную працу і ўклад у развіццё арганізацыі камітэту ССЯАН БДУ, старшыням ССЯАН усіх факультэтаў і актывістам.

Даведка:

Аляксандра Гарбачык з 2021 года вучыцца на спецыяльнасці «правазнаўства» юрыдычнага факультэта. З кастрычніка 2022 года з'яўляецца старшынёй студэнцкага савета па якасці адукацыі і навуцы на факультэце. Раней займала ў арганізацыі пасады кіраўніка кантрольна-рэвізійнай камісіі і намесніка старшыні савета па навуцы.

УНІВЕРСІТЭТ
23 мая 2023 года, № 5 (2270)

Захавальнікі кніжных помнікаў

У гэтым падраздзяленні Фундаментальнай бібліятэкі БДУ працуе ўсяго 6 работнікаў. Але на калектыве ў пэўнай ступені адлюстроўваецца сэнс прыказкі «Хоць маленькі, але ўдаленькі». Знаёмцеся – аддзел гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў.

Студэнт механіка-матэматычнага факультэта Мікіта Лісоўскі

Загадчык аддзела гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў Алена Кінчыкава

Студэнтка юрыдычнага факультэта Аляксандра Гойшык

Падраздзяленне вядзе сваю гісторыю з 1977 года і ў мінулым годзе адзначыла 45-гадовы юбілей. Да 2013 года яно называлася аддзелам рэдкай і каштоўнай кнігі і першапачаткова стваралася для збору, захоўвання і апрацоўкі рэдкіх і каштоўных выданняў, працуючы па прынцыпе чытальнай залы. Зараз жа аддзел, акрамя ўкамплектавання і захоўвання фонду, займаецца суправаджэннем навукова-даследчай і метадычнай дзейнасці, а таксама папулярызуе захоўваемыя выданні. Сімвалічна, што яго сховішчы знаходзяцца ў памяшканнях, дзе некалі размяшчаўся кабінет аднаго з рэктараў універсітэта.

Сёння фонд рэдкіх і каштоўных выданняў Фундаментальнай бібліятэкі складае 15700 кніг і 10200 экзэмпляраў дарэвалюцыйных часопісаў, змяшчаючы выданні па многіх галінах ведаў. А яшчэ тут можна ўбачыць старадрукі, калекцыю рэвалюцыйнага друку, працы класікаў навукі, літаратуры і мастацтва, факсіміле, выданні, вернутыя са спецыяльнага сховішча, кнігі з экслібрысамі і цэнзурнымі праўкамі – усяго не пералічыць. Разам з карэспандэнтам газеты «Універсітэт» прыадчыняем скарбонку набыткаў аддзела гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў.

Галоўны аддзел у краіне

– Помнікі бываюць не толькі манументальныя, але і кніжныя – пра гэта мы гаворым усім, хто становіцца нашымі гасцямі. Падобныя аддзелы ствараліся ў многіх ВНУ, але зараз самым буйным і найстарэйшым сярод іх па-ранейшаму застаецца наш, – заўважае загадчык аддзела і наш праваднік Алена Кінчыкава. – Дарэчы, літаратура ў фондах дзеліцца па трох крытэрыях: храналогіі, унікальнасці, а таксама – мастацкім і паліграфічным афармленні.

Працу па стварэнні аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі пачала Агнэса Сінкевіч, якая стала і першым яго загадчыкам. Пад яе кіраўніцтвам у агульным кнігасховішчы ўніверсітэта былі сабраныя найбольш каштоўныя выданні. Спецыяліст хацела, каб аддзел меў універсальны збор, таму імкнулася, каб туды ўвайшлі кнігі і перыёдыка па розных галінах ведаў. Працу калегі працягнула Лілія Міцкевіч. Загадчыцкую эстафету пасля і пераняла Алена Кінчыкава.

Фонд аддзела, як правіла, папаўняецца супрацоўнікамі з асноўнага фонду БДУ. Аднак бываюць выпадкі, калі кнігі з уласных калекцый у дар перадаюць чытачы. Так аднойчы аддзелу падаравалі 150 рэдкіх выданняў. Адна з найбольш ранніх кніг калекцыі мае скураны пераплёт, адносіцца да рэлігійнай літаратуры і датуецца XVI стагоддзем. Усе кнігі з гэтага збору маюць цікавае афармленне, якое выклікае інтарэс у сённяшніх чытачоў.

Адметна, што найбольш каштоўнымі экзэмплярамі, што захоўваюцца ў аддзеле, лічацца старадрукі – выданні, што былі выдадзены да 1830 года. Тут іх налічваецца больш за 300 экзэмпляраў. А самая «дарослая» сярод іх кніга – «Шэсць лістоў пра рэспубліку» Жана Бадэна 1580 года.

Студэнты – галоўныя чытачы

Пэўны час самымі актыўнымі наведвальнікамі аддзела былі прадстаўнікі гістфака. Яны часта замаўлялі старыя кнігі, якія з-за надта вялікай запатрабаванасці нават распадаліся. Праблема захавання такіх выданняў паўстала надзвычай востра, і супрацоўнікі прыйшлі да высновы, што самым надзейным спосабам засцерагчы кнігі ад зношвання стане алічбоўка матэрыялаў. Так, функцыі забеспячэння аддзелам вучэбнага працэсу і захавання кніг з'ядналіся, не супярэчачы адна адной, і да гэтай пары (з 1990-х гадоў) аддзел займаецца алічбоўкай кніг і перыёдыкі. Вядома, што для захоўвання фонду мэтазгодней аднойчы адсканіраваць падручнік і змясціць яго ў электронную бібліятэку: там яго зможа ў любы момант убачыць неабмежаваная колькасць чытачоў. Цікава, што электронны рэпазіторый БДУ, які цяпер займае высокія пазіцыі ў сусветных бібліятэчных рэйтынгах Еўропы, утварыўся якраз менавіта з гэтай працы. А першымі алічбаванымі выданнямі сталі кнігі па гісторыі Беларусі: на той час яны былі найбольш запатрабаванымі.

– Студэнты – нашы асноўныя чытачы – сёння знаходзяцца ў інтэрнэце, таму мы павінны туды па іх бегчы. У гэтым нам дапамагаюць віртуальныя праекты – віртуальныя выставы, а таксама публікацыя цікавых матэрыялаў рознай скіраванасці. Напрыклад, у дарэвалюцыйных часопісах мы ўбачылі займальную рэкламу паслуг кампаній, якія існуюць зараз, і пастараліся расказаць пра гэта з пазіцыі «мінулае – сучаснасць». Таксама ў нас дзейнічае праект «Кніжныя гісторыі» – з яго дапамогай аддзел знаёміць карыстальнікаў з самымі цікавымі кнігамі фонду. Усе акрэсленыя праекты з'яўляюцца формай папулярызацыі кніжных помнікаў.

Калекцыі старажытных цікавостак

Зараз супрацоўнікі збіраюць калекцыю падручнікаў. Дарэчы, найстарэйшым вучэбным выданнем тут лічыцца кніга «Арифметика сиречь наука числительная» Лявонція Магніцкага, якая ўбачыла свет у 1703 годзе і стала першай вучэбнай энцыклапедыяй па матэматыцы. Каштоўнымі «знаходкамі» фонду можна лічыць «Древнюю российскую историю» Міхаіла Ламаносава, выпушчаную ў 1766 годзе – ужо пасля смерці аўтара, і «Универсальную арифметику» (1768-1769) нямецкага матэматыка Эйлера, што вытрымала 30 перавыданняў на шасці мовах свету. Сярод падручнікаў XVIII стагоддзя вялікую каштоўнасць мае кніга першакрыніц Імператарскай акадэміі навук «Русская летопись по Никонову списку, изданная под смотрением Императорской Академии Наук» 1767 года, а таксама гістарычная калектыўная праца «Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в государственной коллегии иностранных дел» 1819-1894 гг.

Ёсць у сховішчах аддзела і рукапісная кніга – выданне стараабрадцаў канца XVIII – пачатку XIX стст. «Сборник церковно-полемический. "Поучения" отцов Православной Церкви. Слово преподобного Иллариона. Житие Иоанна Златоуста». Асаблівасцю кніг гэтага часу, як можна заўважыць, з'яўляюцца іх доўгія назвы, якія ў свой час служылі ў якасці анатацый для чытача. Алена Уладзіміраўна тлумачыць, што рукапісныя кнігі выходзілі ў свет яшчэ доўгі час пасля вынаходніцтва друкавальных станкоў, асабліва ў часы грамадскіх ці сусветных узрушэнняў – войнаў, навал і да т.п.

– Нехта можа дзівіцца, маўляў, якая каштоўнасць у газет і кніг XIX стагоддзя ў параўнанні з рукапіснымі кнігамі? Але, не думаючы пра іх захаванне сёння, можна згубіць іх для даследаванняў у будучым, – пераканана Алена Кінчыкава.

Вядома, у аддзеле гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў функцыянуюць і іншыя калекцыі: мініяцюрных выданняў, старадрукаў, нацыянальных дакументаў, а таксама выданняў перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Так, збор кніг-мініяцюр налічвае каля тысячы друкаваных «экспанатаў». Кожны з іх унікальны памерам і паліграфічным выкананнем. Студэнты, якія завітваюць у аддзел на экскурсію, заўсёды просяць патрымаць выданні-малюткі ў руках. Яшчэ б: некалі яны былі папулярныя як кнігі, якія можна было насіць у кішэні! Дарэчы, «найменшымі» кнігамі беларускіх класікаў лічаць зборнікі твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, выдадзеныя ў 1972 годзе.

Калекцыя нацыянальных дакументаў увабрала ў сябе экспанаты, якія ў той ці іншай ступені датычацца гісторыі краіны і беларускіх зямель. Яны апісваюць быт беларусаў, іх зносіны, вераванні, прыказкі і прымаўкі. Сярод іх можна ўбачыць «Белорусский архив древних грамот», першы слоўнік Івана Насовіча з аўтографам аўтара, працы Пятра Шэйна па беларускай мове, літаратуры і этнаграфіі, кнігі Уладзіміра Пічэты па гісторыі і інш. Таксама захоўваецца ў фондах калекцыя даваенных выпускаў перыядычных выданняў БДУ: Алена Уладзіміраўна гаворыць, што з 1922 па 1935 год ва ўніверсітэце было выдадзена 28 тамоў «Трудов БГУ», а за 1939 па 1941 год – 5 выпускаў «Учёных записок».

Асаблівую частку сярод выданняў перыяду Вялікай Айчыннай вайны, на думку загадчыцы аддзела, складаюць кнігі, якія выпускаліся, каб палегчыць чалавеку жыццё ў ваенны час. Яны ўздымалі такія пытанні, як выраб драўлянага ці валенага абутку, паперы, лыжак, мыцця бялізны попелам, ужыванне ў ежу дзікарослых раслін і інш.

Убачыць імя творцы

Па словах Алены Кінчыкавай, на экскурсіях (іх штогод праводзяць не менш за 20!) супрацоўнікі арыентуюцца на спецыфіку факультэта, на якім вучацца студэнты, і стараюцца паказаць ім як мага больш выданняў у гістарычным разрэзе. Пра ўсё, што датычыцца фонду, бібліятэкары могуць расказваць бясконца, таму сустрэча гасцей тут падобная да паўнацэнных вучэбных заняткаў. На іх хлопцам і дзяўчатам расказваюць пра асаблівасці перапляцення кніг, лёс аўтараў захоўваемых выданняў, паказваюць іх аўтографы. Найбольшы інтарэс у моладзі выклікаюць тыя выданні, чые аўтары нарадзіліся ў нашай краіне ці мелі да яе нейкае дачыненне. Дарэчы, старыя кнігі падчас экскурсій можна не толькі ўбачыць, але і пагартаць. Робіцца гэта пры дапамозе спецыяльных белых пальчатак, якія спрыяюць збяражэнню кніг. Тут жа можна на ўласныя вочы ўбачыць кнігі з аўтографамі вядомых людзей Беларусі: пісьменнікаў Змітрака Бядулі, Алеся Адамовіча, паэтаў Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, мітрапаліта Філарэта і інш.

А яшчэ ў аддзеле можна пачуць аповед пра кніжныя знаходкі – рэчы, якія чытачы забываліся ўнутры выданняў. Тут іх сабралася каля сотні: сярод забытых рэчаў можна ўбачыць праязныя білеты, фанцікі ад цукерак, паштоўкі, запіскі і нават пісьмы. Адно з іх, напрыклад, напісана школьнікам у дарэвалюцыйную пару пры дапамозе пёравай ручкі, уладальнікам другога «знайдзёныша» стаў Уладзімір Караткевіч, трэцяе – адрасавана зводнаму брату Максіма Багдановіча.

Шмат матэрыялаў для даследаванняў у фондах перыёдыкі аддзела могуць знайсці таксама навукоўцы. У гэтым ім вельмі дапамогуць апісанні найбольш цікавых публікацый часопісаў XIX стагоддзя, над складаннем якіх таксама працуюць супрацоўнікі падраздзялення. А выкладчыкі могуць карыстацца набыткамі аддзела для правядзення практычных заняткаў.

Загадчык лабараторыі беларускага фальклору Вера Дзянісенка

Іван Чаўкота з аднагрупніцамі

Фалькларыстычны «вулей» БДУ

Калі б патэрыянскую сагу здымалі ў нашым універсітэце, вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта запомнілася б па частцы «Гары Потэр і таемны пакой». Гэта месца вабіць першакурснікаў, адкрываецца тым, хто хоча яго знайсці, а таксама захоўвае ў сабе шмат унікальных цікавостак. Заінтрыгаваны? Тады давайце знаёміцца бліжэй!

«Кватарант» новага ўніверсітэцкага корпуса

За час свайго існавання вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору шэсць разоў мяняла месца «прапіскі» і на сёмы знайшла новы і, галоўнае, пастаянны дом. Сёння матэрыялы лабараторыі захоўваюцца ў асобных аўдыторыях новага вучэбнага корпуса БДУ на вуліцы Даўгабродскай. Раўнуткія стэлажы аб'ядналі матэрыялы з пяці напрамкаў: рэгіянальнага і жанравага, аўдыя- і відэаархіваў і архіва фальклору іншых народаў свету. Таксама на аснове гэтых збораў функцыянуе эталонны мультымедыйны банк – фонд лічбавых копій фальклорных матэрыялаў, які размяшчаецца на сайце Электроннай бібліятэкі БДУ. І ўсё гэта пры тым, што працу падраздзялення абслугоўваюць усяго чатыры супрацоўнікі.

Дакументальны статус і новую назву – фонд фальклорных матэрыялаў – фальклорны архіў лабараторыі атрымаў у 2019 годзе, аднак яго гісторыя бярэ пачатак у 1960-х гадах. Тады на філалагічным факультэце БДУ высілкамі кандыдатаў навук дацэнтаў Веры Захаравай і Ніла Гілевіча была ўведзена абавязковая двухтыднёвая палявая вучэбная практыка па збіранні фальклору, матэрыялы якой заклалі аснову фонду. Выкладчыкі настолькі зацікавілі гэтым супрацоўнікаў і студэнтаў, што хутка на аснове прывезеных з экспедыцый матэрыялаў з'явілася вялікая колькасць вучэбных дапаможнікаў і тэматычных зборнікаў. Паступова плён агульнай працы прывёў да стварэння лабараторыі беларускага фальклору. Яна стала пляцоўкай, дзе распрацоўваліся розныя праблемна-тэматычныя напрамкі беларускай школы фалькларыстыкі: лакальна-рэгіянальнае вывучэнне нацыянальнага фальклору, этналінгвістыка, сацыяфалькларыстыка, сучасны гарадскі фальклор, фенаменалогія фальклорных жанраў і інш.

– Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору ў сучасным выглядзе функцыянуе пры кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства (з 2019 года, дагэтуль – кафедра тэорыі літаратуры) з 2005 года. Аднак яе гісторыя налічвае амаль 40 гадоў: з'яўленню лабараторыі папярэдніча ўтварэнне ў 1981 годзе сектара вывучэння фальклорнай дыялекталогіі, які праз 4 гады стаў аднайменнай навукова-даследчай лабараторыяй, – гаворыць загадчык лабараторыі Вера ДЗЯНІСЕНКА. – Нам хочацца, каб студэнтам тут было ўтульна і цікава. Каб яны маглі працаваць з тым скарбам, які захоўваем мы і зберагалі нашы папярэднікі. Лабараторыя фальклору – гэта не проста памяшканні для захоўвання фальклорных матэрыялаў, а месца, дзе развіваецца беларуская школа фалькларыстыкі БДУ. І працуюць тут таленавітыя людзі з высокім узроўнем прафесійнага сумлення.

Інтэр'еры пакояў, што займаюць стэлажы з фальклорнымі матэрыяламі, афармлены ў народным стылі: ёсць у кабінетах розныя побытавыя прадметы, прывезеныя з практыкі, вышываныя ўзоры і партрэты тых, хто стаяў ля вытокаў фалькларыстыкі ў Беларусі – Рыгора Шырмы, Пятра Шэйна, Яўхіма Карскага. Танюткія папкі рэгіянальнага архіва суседнічаюць з больш мажнымі. Кожная з іх прысвечана адпаведнаму году, калі ў той ці іншай мясцовасці вяліся фалькларыстычныя экспедыцыі. Цікава, але ў некаторых папках можна знайсці добра знаёмыя цяперашнім студэнтам прозвішчы выкладчыкаў філалагічнага факультэта, якія раней таксама спрабавалі свае сілы «ў палях». Сярод такіх асоб – намеснікі дэкана філалагічнага факультэта Мікалай Хмяльніцкі і Вольга Крычко, дацэнт Ігар Запрудскі. Па словах Веры Сяргееўны, «у рэгіянальным архіве знаходзіцца частка яе жыцця», паколькі падчас фальклорнай практыкі адным з яе суразмоўцаў стала родная бабуля. Таму вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору – гэта своеасаблівы летапіс БДУ.

Я пазнаю архіў па радках

У жанравым архіве фонду фальклорных матэрыялаў захоўваюцца рукапісныя карткі з указаннем жанравай прыналежнасці твораў. Так, у гэтым зборы пасяліліся вясельныя і калядныя песні, калыханкі, казкі і іншыя. Цяпер каля 350 тысяч картак, запоўненых уручную, чакаюць алічбоўкі, каб стаць больш даступнымі для даследчыкаў. Аўдыя- і відэаархіў утрымліваюць бабіны, касеты і кінастужкі. Напрыклад, за перыяд з 1960 па 1980 гг. з фальклорных практык прывезлі 632 бабіны і 721 касету, і ўсе яны захоўваюцца ў фондзе. А папкі архіва фальклору іншых народаў свету складаюць матэрыялы, запісаныя студэнтамі краін былога СССР, Кітая, Індыі, Ірана і інш.

Самым «дарослым» зборам інфармацыі з'яўляецца архіў Гомельскай вобласці (першыя запісы датуюцца 1960 годам), а найбольш багатым стаў архіў Міншчыны (тут захоўваецца 1589 папак, што ўтрымліваюць 165 тысяч твораў). Асабліва каштоўная частка фонду – матэрыялы, сабраныя на тэрыторыях, якія пацярпелі ад выбуху на Чарнобыльскай АЭС. Для тых, хто будзе працаваць з гэтымі матэрыяламі, можа быць важнай любая дробязь з дзённікаў.

Кожны матэрыял, які трапляе ў зборы, праходзіць пашпартызацыю: збіральнікі фальклору запаўняюць спецыяльныя дзённікі, указваюць імёны і прозвішчы сваіх суразмоўцаў, звесткі пра сябе, фіксуюць год і месца запісу. Многія тэкставыя матэрыялы дапаўняюцца фотаздымкамі, відэа- і аўдыяфайламі. Адметна, што да 2012 года архіў быў цалкам рукапісны, дадатковыя лічбавыя носьбіты інфармацыі выкарыстоўваліся нячаста. Аднак праз патрабаванні часу і пашырэнне тэхнічных магчымасцяў фалькларыстаў было прынята рашэнне падмацоўваць сабраную інфармацыю аўдыяфайламі і фотаздымкамі. Так сярод папяровых «жыхароў» архіва з'явіліся яшчэ і лічбавыя – CD- і DVD-дыскі, флэшкі. Такі падыход да «палявой» практыкі і захоўвання матэрыялаў дазваляе навукоўцам з сумежных галін (гісторыкам, лінгвістам і інш.) рабіць высновы пра асаблівасці гаворак той ці іншай мясцовасці, уклад жыцця, стыль, рамёствы, узаемаадносіны людзей.

– Магчыма, нейкія рэчы сёння могуць падавацца малазначнымі. Аднак праз 20 гадоў мовазнаўцы, выкарыстоўваючы запісы ў дзённіках, змогуць глыбей вывучаць гаворкі пэўнай мясцовасці. Любы карабель ідзе далей, калі ў яго каманды ёсць паслядоўнікі, – пераконвае загадчыца лабараторыі беларускага фальклору.

Цікава, але першапачаткова фонд фальклорных матэрыялаў быў закрытым – ім маглі карыстацца толькі даследчыкі-фалькларысты ўніверсітэта і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З нядаўняга часу ён стаў больш даступным: зараз папрацаваць тут маюць магчымасць супрацоўнікі БДУ, навуковыя пошукі якіх звязаныя з сумежнымі галінамі, для выкарыстання ў адукацыйным працэсе і даследчай дзейнасці па профілі, студэнты для напісання навуковых і кваліфікацыйных работ і выкладчыкі філфака. Фізічныя асобы могуць атрымаць доступ да фонду ў межах аказання платных паслуг з пісьмовага дазволу загадчыка лабараторыі з абавязковым указаннем мэты наведвання. Вера Сяргееўна ўзгадвае гісторыю, як у мінулым годзе да супрацоўнікаў звярнуўся наведвальнік, які хацеў адшукаць песню сваёй бабулі. І, паколькі яго сястра занатавала гэты твор падчас праходжання практыкі шмат гадоў назад, знаходка стала магчымай.

Вера Дзянісенка адзначае, што ў краіне няшмат прафесіяналаў у галіне фалькларыстыкі. Не дзіва, паколькі падобны спецыяліст павінен валодаць сінтэзам фалькларыстычных, архівазнаўчых і нават літаратуразнаўчых ведаў. Першыя дапамагаюць правільна збіраць і афармляць інфармацыю, другія – захоўваць яе, трэція – карэктна апрацоўваць і класіфікаваць.

Дарога ў фалькларыстыку пачынаецца з практыкі

Першакурснік Іван ЧАЎКОТА пазнаёміўся з фальклорнымі матэрыяламі лабараторыі яшчэ ў верасні – тады ён разам з іншымі студэнтамі дапамагаў супрацоўнікам у перазных клопатах, размяркоўваў папкі па паліцах. Хлопца і яго аднагрупніц, якія прыйшлі ў лабараторыю на заняткі разам з кандыдатам філалагічных навук дацэнтам Вольгай Прыемка, у хуткім часе чакае першая практыка: нехта паедзе на практыку ў дробныя населеныя пункты – па месцы жыхарства ці ў вёскі да бабуль. Іншыя пройдуць практыку пры лабараторыі, дзе ім перададуць асновы архіўнай справы і каталагізацыі дакументаў.

Як падысці да патэнцыяльнага суразмоўцы, каб настроіць яго на камунікацыю? Як правільна пачаць гутарку? Як атрымаць асалоду ад працэсу збірання інфармацыі? Гэтыя і іншыя пытанні раскрываюцца ў ВМК «Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі», якое вытрымала тры перавыданні дзякуючы выкладчыкам кафедры тэарэтычнага славянскага літаратуразнаўства і супрацоўнікам лабараторыі беларускага фальклору. Тут жа яны знойдуць кіраўніцтва па класіфікацыі твораў. Вольга Віктараўна, расказваючы студэнтам пра практыку, прыводзіць прыклад, што ў фільме «Аперацыя Ы» Леаніда Гайдая стваральнікі дапусцілі вольнасць у інтэрпрэтацыі фальклору, паколькі тосты не адносяцца да фальклорных жанраў.

– Фальклор – гэта найбагацейшы комплекс, бо ў ім сінкрэтычна зліваюцца розныя культурныя элементы: слова, мелодыя, танец, абрады, прыкметы і павер'і, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. І мы стараемся як мага часцей падкрэсліваць гэту адметнасць, – заўважае Вольга Віктараўна. – Якім было вяселле вашых дзядуль і бабуль? Што тады гатавалі? Якія калыханкі спявалі вашым бацькам? Як пазнаёміліся бабуля з дзядулем? Задайце гэтыя пытанні вашым родным і здыміце іх на камеру. Уявіце, як будзеце паказваць гэта відэа сваім дзецям! Усё гэта датычыцца гісторыі вашай сям'і, таму выканайце работу па праходжанні практыкі якасна найперш для сябе.

Па словах выкладчыка, прывезеныя з «палёў» матэрыялы, як правіла, не залежваюцца ў архівах. Супрацоўнікі лабараторыі беларускага фальклору пры падтрымцы кафедры стараюцца публікаваць вынікі экспедыцый у спецыялізаваных зборніках. Гэта дазваляе зрабіць культурную спадчыну больш даступнай для даследчыкаў і аматараў фальклору. Адзін з такіх зборнікаў – «Фалькларыстычныя даследаванні». Тут нароўні з вядомымі навукоўцамі вострацъ пяро ў напісанні навуковых артыкулаў студэнты. Гэта стала магчымым у тым ліку дзякуючы таму, што цэнтральнай часткай дзейнасці кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства і лабараторыі беларускага фальклору з'яўляецца распрацоўка навуковых і праблемных тэм.

Вера Сяргееўна падзялілася, што дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва факультэта на базе лабараторыі плануецца адкрыццё інтэрактыўных аўдыторый, якія будуць насіць імёны яе заснавальнікаў, – Веры Захаравай і Васіля Ліцвінкі.

– Спадзяёмся, што гэта будзе новы віток у жыцці вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору. Хочацца, каб пра яе ведала як мага больш людзей, каб навучальны працэс для студэнтаў праходзіў тут не сумна, а таксама захапляў, вабіў і натхняў на навуковыя пошукі, – рэзюмавала загадчыца лабараторыі беларускага фальклору.

Матэрыялы развароту падрыхтавала Ірына ІВАШКА

УНІВЕРСІТЭТ
23 мая 2023 года, № 5 (2270)

За «партай» у прафесара Ходзіна

Партрэт юбіляра разам з газетай «Універсітэт» малююць вучні прафесара

«У ім спалучаюцца выдатныя кіраўніцкія якасці, педагагічны дар і талент вучонага», «ён чалавек-акіян», які «застаецца тактоўным нават у сітуацыях, калі гэта вельмі складана»… Такімі словамі апісваюць доктара гістарычных навук, загадчыка кафедры крыніцазнаўства Сяргея Ходзіна, які 31 мая адзначыць 60-годдзе.



«Хросны бацька» ў навуцы

Кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Арцём ПРЫБАРОВІЧ ведае Сяргея Ходзіна з ліпеня 2005 года, калі прыйшоў паступаць на гістфак БДУ. У дзень залічэння Сяргей Мікалаевіч сустракаўся з будучымі студэнтамі ў вялікай аўдыторыі. Яго было чуваць з любога кутка, хаця дэкан гаварыў не вельмі гучна. Хлопца адразу ўразіла, як выкладчык умее рацыянальна выкарыстоўваць сілу голасу.

– Калі прыйшла мая чарга выбіраць спецыяльнасць, я пайшоў па напрамку кафедры крыніцазнаўства, бо падказку, што я не пашкадую пра сваё рашэнне, даў Сяргей Мікалаевіч, які тады ўжо загадваў кафедрай. Так ён першы раз паўплываў на мой лёс, – узгадвае Арцём Аляксандравіч. – У аспірантуры я вучыўся пад кіраўніцтвам прафесара Уладзіміра Нікіфаравіча Сідарцова, пачаў выкладаць. Аднак да абароны дысертацыі мы не дайшлі, і я адмовіўся ад гэтай ідэі ўвогуле.

У 2015 годзе Сяргей Мікалаевіч запрасіў маладога чалавека пад сваё навуковае кіраўніцтва, сказаўшы: «Калі Вы не плануеце абараняць сваю першую працу, не спыняйцеся. Я гатовы прапанаваць вам іншую тэму». Новая тэма была прысвечана статыстычным матэрыялам БССР у міжваенны перыяд. І ў 2019 годзе Арцём Прыбаровіч абараніўся.

– Пры напісанні дысертацыі вельмі важная падтрымка навуковага кіраўніка, з боку Сяргея Мікалаевіча яна адчувалася заўсёды. Больш за тое, ён не пабаяўся ўзяць мяне на «паўторнае» напісанне кандыдацкай, хоць з боку іншых людзей заўважаўся скепсіс. Ён разгледзеў ува мне патэнцыял і, можна сказаць, даў мне другі шанец, бо на той час я задумваў сысці з БДУ. Так Сяргей Мікалаевіч адыграў важную ролю ў маім жыцці другі раз, – дзеліцца гісторык.

У размове пра юбіляра Арцём Аляксандравіч узгадвае гісторыю з часоў напісання дысертацыі: прафесар тэлефанаваў яму, каб абмеркаваць нюансы працэсу абароны. Аспірант ехаў у транспарце, дзе было шумна, разам з тым на тэлефоне садзілася батарэйка, але сказаць, што ён дрэнна чуе Сяргея Мікалаевіча, было няёмка. Праз 5 хвілін размовы, падчас якой агучваліся важныя рэчы, прафесар запытваецца: «Вы мяне зразумелі?» А вучань адказвае: «Не, я не зусім вас пачуў». Здавалася, што выкладчык пакрыўджаны такімі адносінамі. Аднак не прайшло і паўгадзіны, як Сяргей Мікалаевіч, быццам бы забыўшыся пра гэты выпадак, з няменшым імпэтам расказваў аспіранту ўсё агучанае раней наноў.

– Сяргей Мікалаевіч Ходзін – гэта мой «хросны бацька» ў навуцы, які заўсёды знойдзе, як падтрымаць, дасць параду. Ён вельмі сціплы – пра гэта скажуць усе калегі. Побач з ім не адчуваецца няроўнасці – ён заўсёды на адной хвалі з вучнямі і з калегамі, – кажа Арцём Прыбаровіч. – Работу Сяргея Мікалаевіча са мной можна апісаць словамі Паўла Каэлья: «Настаўнік – гэта не той, хто нечаму вучыць, а той, хто дапамагае свайму вучню раскрыць ужо вядомае яму». Ён разумеў, што я нямала ведаю, але ў той жа час усведамляў, што мала разумею гэтыя веды з пункту гледжання важнасці для майго жыцця. Сяргей Мікалаевіч першапачаткова адносіцца да цябе як да прафесіянала і давярае. Ён прыклад таго, як у чалавеку могуць спалучацца выдатныя кіраўніцкія якасці, педагагічны дар і талент вучонага.

Сінтэз якасцей менеджара, вучонага і выкладчыка

Дырэктар навукова-тэхналагічнага парка «ІнКата» Яўген МАЛЬЧЭЎСКІ ўпершыню сустрэў Сяргея Ходзіна на сходзе абітурыентаў, як і Арцём Прыбаровіч. У 2004 годзе юнак паступіў на спецыяльнасць «дакументазнаўства», якую нядаўна адкрылі на факультэце. Так склалася, што многія з будучых студэнтаў не разумелі, што яна сабой уяўляе. Тады Сяргей Мікалаевіч у выступленні перад моладдзю вельмі жыва намаляваў перспектывы, якія адкрываюцца для будучых дакументазнаўцаў. Хлопец натхніўся і крыху здзівіўся, паколькі дэкан нават з першакурснікамі трымаўся вельмі проста і ўважліва выслухоўваў пытанні кожнага, нягледзячы на статус і відавочную занятасць.

На другім курсе студэнт звярнуўся да прафесара Ходзіна, каб той стаў яго навуковым кіраўніком. І так склалася, што гэта ўзаемадзеянне вылілася ў дзевяцігадовы навуковы шлях да абароны кандыдацкай дысертацыі Яўгена Мальчэўскага.

– Нягледзячы на спецыялізацыю Сяргея Мікалаевіча ў гістарычнай тэматыцы, ён заўсёды вельмі дакладна бачыў перспектыўныя напрамкі ў іншых сферах, у тым ліку тых, што напрамую з гісторыяй не звязаныя. Так, менавіта ён падказаў мне кірунак даследаванняў у галіне менеджменту інавацый і інтэлектуальнай уласнасці. І вынікам яго парады стала тое, што я абараніў дысертацыю ў гэтай сферы і знайшоў тут сваё прызванне, – заўважыў Яўген Сяргеевіч.

Яўген Мальчэўскі перакананы, што, калі б пра Сяргея Ходзіна здымалі фільм, ён абавязкова насіў бы назву «Як аматар матэматыкі стаў вядомым гісторыкам». А раскажа ён гісторыю пра тое, як прафесар захапляўся матэматыкай, але сваё сэрца назаўсёды аддаў гісторыі.

– Мне заўсёды імпанавалі такія рысы Сяргея Мікалаевіча, як адкрытасць, прыстойнасць і сумленнасць. Але больш за ўсё мяне заўсёды здзіўляла, наколькі ён тактоўны і ветлівы чалавек, і застаецца такім нават у сітуацыях, калі гэта было вельмі складана, – кажа Яўген Сяргеевіч. – Прафесар сінтэзуе ў сабе якасці выбітнага менеджара, аўтарытэтнага вучонага і выкладчыка. Як настаўнік, Сяргей Мікалаевіч вельмі ініцыятыўны, заўсёды адкрыты да нечага новага, што не можа не натхняць і не заряджаць энергіяй яго вучняў. Як мой навуковы кіраўнік, прафесар не дзяжурна выконваў свае абавязкі, а заўсёды падтрымліваў. Ён ніколі не заставаўся ўбаку і дапамагаў вырашаць праблемныя пытанні, нават калі гэта не было звязана з яго функцыямі навуковага кіраўніка. А яшчэ ён навучыў мяне бачыць свае хібы, а таксама раскрываць і выкарыстоўваць моцныя бакі.

Імкненне да развіцця – лейтматыў яго жыцця

Старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Ляна ІВАНІЧАВА з Сяргеем Ходзіным прайшлі шлях абароны дыпломнай работы і магістарскай дысертацыі. Наперадзе ў гэтага акадэмічнага тандэма – напісанне і абарона кандыдацкай дысертацыі. А пазнаёмілася яны ў 2009 годзе, калі спецыяліст прыйшла працаваць на кафедру, якую ўзначальвае прафесар. Ляна Сяргееўна жартуе, што ўражанні, як у імпрэсіяністаў, не прымусілі сябе доўга чакаць. З гэтай сустрэчы яна запомніла Сяргея Мікалаевіча як сканцэнтраванага чалавека, які хутка прымае рашэнні. У першы месяц працы выкладчыку-навічку падавалася, што супрацоўнікі кафедры не заўсёды паспяваюць за думкамі кіраўніка, якія часта аказваліся ў будучым.

Па словах Ляны Сяргееўны, прафесар Ходзін – гэта чалавек, які ўмее марыць пра будучыню адукацыі. Ён знаходзіцца ў пошуку адказаў на выклікі часу, яго думкі выходзяць за межы ўласных ідэй і перажыванняў. А імкненне да развіцця і абнаўлення – увогуле лейтматыў яго жыцця.

– Сяргей Мікалаевіч – гэта акіян, найскладанейшая экасістэма, дзе кожная часцінка мае значэнне, – адзначае старшы выкладчык. – З асаблівай удзячнасцю прымаю яго вопыт і дзякую гэтаму чалавеку, што дапамагае бачыць карціны навуковага свету шматграннымі. Паміж намі ўсталяваліся вельмі цёплыя адносіны: не толькі ў кантэксце «настаўнік – вучань», але і працоўныя, дзе прысутнічае яшчэ большая адказнасць за тое, чым ты займаешся, і разам з тым свабода педагагічнай творчасці. За 14 гадоў знаёмства з Сяргеем Мікалаевічам адбылося шмат запамінальных гісторый, але ўсе яны нечаму навучылі: думаць, як ён, бачыць сітуацыі і правільна на іх рэагаваць, рабіць уласны выбар.

«Чалавек, які мяне стварыў як даследчыка»

Кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Андрэй ЛАТУШКІН – адзін з першых вучняў прафесара Ходзіна. Як і многія студэнты гістфака 1996 года, з Сяргеем Мікалаевічам ён сутыкнуўся як з выкладчыкам крыніцазнаўства. З другога курса прафесар кіраваў курсавымі і дыпломнай работай хлопца: з яго падачы ў вучонага-пачаткоўца і нарадзілася цікавасць да пісьмовых крыніц часоў ВКЛ.

– Самы першы вобраз Сяргея Мікалаевіча, які адбіўся ў маіх успамінах, гэта вобраз вучонага, які грунтоўна даследуе гісторыю, абапіраючыся на пісьмовыя крыніцы. Нават з пункту гледжання знешнасці ён прыцягваў студэнтаў, паколькі на той момант насіў бараду. Дзякуючы прафесару, я далучыўся да гісторыі, зразумеў, якая гэта вялікая навука, – узгадвае Андрэй Мікалаевіч.

Кандыдат гістарычных навук адзначае, што Сяргей Ходзін – гэта чалавек, які заўсёды даваў свабоду дзеяння ў даследаваннях, не навязваў уласны пункт гледжання, але, калі гэта патрабавалася, акуратна скіроўваў у патрэбны бок. Узаемадзеянне з Сяргеем Мікалаевічам ніколі не было дыктатам: педагог заўсёды рабіў спробы зразумець, што блізка маладому чалавеку, таму прапановы, звязаныя з навуковымі пошукамі хлопца, развівалі вучня, а не пераследавалі цікавасць настаўніка. Толькі пры такіх умовах, на думку Андрэя Мікалаевіча, і мог у поўнай ступені раскрыцца талент студэнта.

– Майстэрства Сяргея Мікалаевіча як навуковага кіраўніка заключаецца ў тым, што ён ніколі не прэсінгуе сваіх студэнтаў. І правільна, паколькі стварэнне тэкстаў даследаванняў мае асаблівую спецыфіку: гэта спецыфічная і непрадказальная праца. Здараецца, ты не можаш займацца гэтым фізічна, бываюць моманты, калі цяжка з доступам да нейкіх пісьмовых крыніц, што адцягвае працэс напісання. А ён давярае студэнтам, што выклікае большы ўзровень адказнасці з іх боку.

Па словах выкладчыка, Сяргей Ходзін – чалавек з добрым пачуццём гумару – ён разумее жарты і падтрымлівае іх, што дазваляе наладжваць дзейсную камунікацыю са студэнтамі і калегамі. Адны з галоўных якасцей прафесара – адказнасць і павага да людзей. За 30 гадоў, пакуль Андрэй Мікалаевіч яго ведае, Сяргей Мікалаевіч ніводнага разу не дазволіў сабе перайсці межы карэктнасці. «Навучанне праз давер» – менавіта тая фраза, што, на думку Андрэя Мікалаевіча, апісвае юбіляра як педагога. Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі адносіны прафесара Ходзіна і яго аспіранта Латушкіна не перарваліся, а сталі яшчэ больш трывалымі.

– Настаўнікі назаўжды застаюцца настаўнікамі для сваіх выхаванцаў, у якіх яны ўкладваюць частку сябе. І такія адносіны працягваюцца ўсё жыццё, нягледзячы на ўзрост і змены статусу, – падагульніў Андрэй Латушкін. – Каб я пісаў кнігу пра яго, то назваў бы яе «Чалавек, які стварыў мяне як даследчыка». Бо калі справядліва паглядзець, то ў маім жыцці так і атрымалася. Цяжка ўявіць, як склаўся б прафесійны лёс, калі б у ім не сустрэўся Сяргей Ходзін.

Ірына ІВАШКА

Уражанні студэнтаў з Паднябеснай

У БДУ атрымліваюць адукацыю больш за дзве тысячы кітайскіх грамадзян. На факультэце журналістыкі колькасць студэнтаў з Паднябеснай толькі на першай ступені навучання дасягае амаль 400 чалавек.

Чжаа Сюань

Ван Ке

Хуан Лін

У 2021 годзе на факультэце быў створаны беларуска-кітайскі медыяцэнтр, дзе студэнты абедзвюх краін практыкуюцца ў стварэнні медыйных прадуктаў: здымаюць відэасюжэты і рыхтуюць матэрыялы для публікацыі ў сацыяльных сетках.

Мы спыталі ў студэнтаў-аднагрупнікаў з Кітая, чаму яны выбралі БДУ. Нашых герояў аб'ядноўвае не толькі нумар групы, але і любоў да рускай мовы.

Чжаа Сюань прыехала з горада Чэнду і зараз вучыцца на 3 курсе па спецыяльнасці «вэб-журналістыка». Каля трох гадоў таму дзяўчына пачала вывучаць рускую мову. Ёй вельмі спадабалася вымаўленне, што і стала адной з прычын, каб распачаць пошукі рускамоўных ВНУ за мяжой.

Пра Беларусь Сюань даведалася ад сваёй цёткі, якая ўжо даўно працуе ў краіне ў сферы адукацыі. Яна і параіла дзяўчыне БДУ. Пасля ўласнага інтэрнэт-расследавання абітурыентка канчаткова вырашыла паступаць менавіта ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і не расчаравалася. За час пражывання і навучання ў Беларусі яна назапасіла шмат уражанняў і цікавых гісторый. Па заканчэнні студэнтка плануе вярнуцца ў родны горад да сваёй сям'і і там адкрыць уласны бізнес.

– Мне запомнілася адна сустрэча. Калі я ўпершыню ў Беларусі выклікала таксі, выявілася, што ў мяне не засталося наяўных дробных грошай. Я сказала кіроўцу, што магу пайсці ў банк і размяняць, але ён адказаў, што не трэба турбавацца, і бясплатна давёз да патрэбнага месца. У той момант я падумала, што беларусы вельмі прыязныя і цёплыя людзі. У навучанні ў БДУ я адзначыла шмат асаблівасцяў. Напрыклад, выкладчыкі ў Беларусі і Кітаі вельмі адрозніваюцца. Тут мы можам актыўна абмяркоўваць любыя пытанні, шмат размаўляць па тэме, а ў Кітаі – трэба проста слухаць і запамінаць, што кажа выкладчык. Замежным абітурыентам я пажадала б не баяцца паступаць у БДУ, але вельмі раю не адкладаць і загадзя вучыць рускую мову, каб лепш разумець, што кажуць на занятках.

Студэнт **Ван Ке** прыехаў у Мінск з горада Ухань. Хлопец пачаў цікавіцца рускай мовай у 2019 годзе, калі яшчэ жыў у Кітаі. Ён хацеў атрымаць якасную адукацыю і пасля доўгіх роздумаў абраў журфак БДУ. Ван Ке любіць абедзве краіны, і яго будучая прафесія дазваляе не абіраць толькі адну з іх. Пасля заканчэння вучобы ў планах хлопца працаваць журналістам паміж Кітаем і Беларуссю.

– На мой погляд, я атрымліваю добрую падрыхтоўку па спецыяльнасці, на факультэце мудрыя выкладчыкі і цікавы навучальны працэс. Думаю, што калі б нейкі мой сябра вырашыў вывучаць рускую мову, то я б сказаў, што Беларусь для гэтага – найлепшы варыянт. Але навучанне ў нашых краінах вельмі адрозніваецца. Звычайна ў Кітаі мы робім шмат дамашніх заданняў і пішам канспекты, а тут мы больш размаўляем, прымяняем свае веды на практыцы: здымаем і манцыруем відэа, пішам матэрыялы. Гэтым мне і падабаецца БДУ – у студэнта тут шмат свабоды.

Мне запомніўся ўдзел у рэканструкцыі. На радзіме з такімі заняткамі я не сутыкаўся і тут адкрыў для сябе, як мне падабаецца гісторыя. У Беларусі ўсё іншае: культура, музыка, ежа. Але гэта і цікава, і ўдзел у такіх мерапрыемствах, як рэканструкцыя, толькі бліжэй знаёміць мяне з краінай, у якой я зараз жыву. Дзякуючы гэтай падзеі ў мяне з'явілася шмат сяброў-беларусаў.

Ван Ке прызнаецца, што часам сумуе па радзіме, і ў паўсядзённае жыццё імкнецца прыўнесці частку роднай культуры:

– Я жыву ў інтэрнаце, там добрыя ўмовы. Мае суседзі па пакоі – таксама кітайскія студэнты, таму нам зручна разам гатаваць ежу. Асабліва я люблю тофу, знайсці яго тут не вялікая праблема, бо ён прадаецца ў беларускіх гіпермаркетах.

Студэнтка **Хуан Лін** прыехала з горада Цюаньчжоу. Яе бацька бізнесмен і вядзе справы ў асноўным з рускамоўнымі людзьмі, таму з дзяцінства кніжныя паліцы ў доме былі запоўнены рускімі творамі. Маленькая Лін ва ўсім брала прыклад з бацькі, таму, каб мець магчымасць прачытаць усе кнігі ў доме, дзяўчынка пачала вучыць мову, на якой яны напісаны. З узростам гэта паўплывала на выбар краіны для атрымання адукацыі. Для дзяўчыны было важна, каб яе атачалі носьбіты рускай мовы.

Зараз яна здымае кватэру з сяброўкай, рыхтуецца да летняй сесіі і будуе планы на будучыню. Па сакрэце яна падзялілася сваёй запаветнай марай стаць выкладчыцай. У Кітаі гэтая прафесія лічыцца вельмі ганаровай, і студэнтка лічыць, што такая цікавая і важная справа жыцця прынясе ёй толькі шчасце.

– Пасля заканчэння ўніверсітэта я хацела б працягнуць навучанне. Думаю паступіць у магістратуру ў Расіі. Але пакідаць Беларусь назаўжды не планую, мабыць, вярнуся са ступенню магістра і пачну будаваць кар'еру ўжо тут.

Ва ўніверсітэце можна пазнаёміцца з рознымі цікавымі людзьмі, але асабліва нечаканым для мяне было тое, што цёплыя адносіны можна наладзіць з выкладчыкамі. Яны адкрытыя, з імі можна абмеркаваць што заўгодна, як з сапраўднымі сябрамі, і яны ніколі не пакінуць у бядзе. Гэта тая рыса беларускіх выкладчыкаў, з-за якой я б параіла БДУ для паступлення ўсім сваім знаёмым.

Ганна КАЗАКОВА

«Яднанне культур дапамагае стварыць талерантную прастору для студэнтаў розных краін»

Праект Савета зямляцтваў БДУ ўзнагароджаны дыпломам у спецыяльнай намінацыі «У Беларусі – як дома!» Рэспубліканскага моладзевага фестывалю-конкурсу «Медыясфера – 2023».

Дзень нацыянальных культур упершыню правялі ў БДУ ў 2017 годзе. Мультыкультурная выстава-дэгустацыя стала ўжо традыцыйным святам і звычайна ладзіцца ў лістападзе. У гэтым годзе, па падліках арганізатараў, каля 300 навучэнцаў універсітэта сталі ўдзельнікамі мерапрыемства – сярод іх прадстаўнікі Азербайджана, Палесціны, Кітая, Таджыкістана, Узбекістана і Туркменістана.

Акрамя «смачнай» часткі свята – дэгустацыі страў нацыянальнай кухні – удзельнікі і госці наведваюць майстар-класы па народных танцах, а таксама знаёмяцца з нацыянальнай атрыбутыкай і спяваюць народныя песні.

Кіраўнік праекта – студэнтка 4 курса філалагічнага факультэта БДУ Лейлі ДЖУМАКУЛЫЕВА – ужо некалькі гадоў арганізоўвае Дзень нацыянальных культур ва ўніверсітэце. Таму менавіта яна прадстаўляла праект на фестывалі-конкурсе.

– Дзень нацыянальных культур створаны для таго, каб паказаць усю разнастайнасць культур, нацыянальнасцяў, рэлігій і дапамагчы адчуць яднанне студэнтам, якіх універсітэт прымае пад сваё крыло. Таму адначасова адбываецца знаёмства беларусаў з культурамі іншых краін і замежных студэнтаў – з мясцовай культурай, каб яны прасцей адаптаваліся да новых умоў жыцця. У нас нават была тэматычная пляцоўка беларускай культуры. Але, на мой погляд, яднанне культур не столькі ў правядзенні сумесных мерапрыемстваў, колькі ў стварэнні бяспечнай, талерантнай прасторы, дзе кожны студэнт будзе ведаць, што ён не адзін са сваімі праблемамі і што ёсць людзі, якія гатовыя дапамагчы, – тлумачыць Лейлі. – Праект прадугледжвае не толькі ўдзел студэнтаў БДУ. Мы запрашалі яшчэ і студэнтаў іншых універсітэтаў. Напрыклад, у гэтым навучальным годзе да нас далучыліся прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Раней на конкурсы не падавалі гэты праект Савета зямляцтваў БДУ, але сёлета арганізатары вырашылі паспрабаваць. «Дзень нацыянальных культур» ідэальна падышоў пад крытэрыі Рэспубліканскага моладзевага фестывалю-конкурсу «Медыясфера – 2023». За прэзентацыю для конкурсу Лейлі ўзялася адказна і пад чулым курыраваннем начальніка аддзела моладзевых праграм і праектаў упраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю Антона КУПЧЫНА вывела актуальнасць, мэты і задачы праекта.

Рэспубліканскі фестываль праводзіцца ўжо чацвёрты год. Ён аб'яднаў творчую моладзь, якая спрабуе сябе ў галіне фатаграфіі, друку, кіна- і відэамастацтва. У 2023 годзе было пададзена больш за 320 заявак ад студэнтаў беларускіх ВНУ, навучэнцаў школ, гімназій і ліцэяў з усіх абласцей Беларусі.

Конкурс праходзіў у пяці намінацыях: «Друкаваныя СМІ», «Электронныя СМІ (ТБ)», «Фотапраект», «Інтэрнэт-праект» і «Камунікацыйны праект». Так, паводле вынікаў адбору, у фінал выйшлі 65 праектаў. Тэма работ 2023 года – «Мы, беларусы – мірныя людзі, сэрцам адданыя роднай зямлі...». Праекты былі прысвечаны гісторыі Беларусі, дыялогу культур і рэлігій, подзвігам беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ролі моладзі ў лёсе сваёй краіны. Арганізатарам фестывалю выступіў ГрДУ імя Янкі Купалы.

Ад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта было пададзена тры праекты, але вылучылі сярод іх менавіта «Дзень нацыянальных культур». Дыплом кіраўніку праекта ўручылі 14 красавіка, у Гродне, на цырымоніі ўшаноўвання прызёраў конкурсу.

– Мы не чакалі, што пройдзем у фінал, але нас запрасілі ў Гродна. Сустрэлі вельмі гасцінна, з творчымі нумарамі і песнямі, засялілі ў інтэрнат. У першы дзень фестывалю мы сабраліся для прагляду і абмеркавання аўтарскіх прац, дзе кожны мог пазнаёміцца з праектамі, якія выйшлі ў фінал. У той жа дзень для нас правялі майстар-класы па самых розных медыйных напрамках. Спікеры дзяліліся досведам працы ў СМІ. Хацелася патрапіць на ўсе семінары, але яны перасякаліся па часе, таму для сябе я выбрала рэкламу і PR-камунікацыі. Самай запамінальнай падзеяй была экскурсія па Гродне. Раней я ніколі не была ў гэтым горадзе. Таму для мяне конкурс аказаўся яшчэ і выдатнай магчымасцю падарожнічаць, убачыць прыгожыя месцы, – дзеліцца ўражаннямі кіраўніца праекта.

У гэтым годзе Лейлі заканчвае навучанне і плануе вярнуцца дадому ў Туркменістан. Але дзяўчына не плануе з'язджаць назаўжды. Праз некаторы час яна мае намер зноў прыехаць у Беларусь і будаваць кар'еру тут, паспрабуе працягваць навучанне ў магістратуры ФМА. Лейлі прызнаецца, што за 4 гады вучобы БДУ стаў пляцоўкай для рэалізацыі самых розных яе задумак. І ўзнагарода, якую студэнтцы ўручылі за праект, толькі пацвярджэнне таго, што добрая ініцыятыва не застаецца незаўважанай.

Ганна КАЗАКОВА

УНІВЕРСІТЭТ
23 мая 2023 года, № 5 (2270)

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

Біялагічны факультэт

Назва пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду*	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Загадчык кафедры малекулярнай біялогіі	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 7 гадоў.
Прафесар кафедры малекулярнай біялогіі	1 год	
Дацэнт кафедры генетыкі**	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 5 гадоў. **У дадатак да асноўнага пераліку дакументаў неабходна падаць у конкурсную камісію заключэнне метадычнай камісіі пра якасць правядзення лекцыйных заняткаў.
Дацэнт кафедры біяхіміі	3 гады	
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 10, каб. 212; па 21 чэрвеня. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул Курчатава, 10, каб. 212; па 20 ліпеня.		

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук

Назва пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду*	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі	5 гадоў	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы ці вынаходствы, патэнты, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 7 гадоў.
Прафесар кафедры філасофіі культуры	5 гадоў	
Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 5 гадоў.
Дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі	1 год	
Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі	5 гадоў	
Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі	2 гады	
Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі	4 гады	
Дацэнт кафедры філасофіі культуры	5 гадоў	
Дацэнт кафедры агульнай і медыцынскай псіхалогіі	2 гады	
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; па 21 чэрвеня. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; па 20 ліпеня.		

Факультэт міжнародных адносін

Назва пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду*	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Загадчык кафедры міжнародных адносін	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы ці вынаходствы, патэнты, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 7 гадоў.
Прафесар кафедры міжнародных адносін	5 гадоў	
Прафесар кафедры міжнародных адносін	3 гады	
Загадчык кафедры міжнародных эканамічных адносін	5 гадоў	
Загадчык кафедры еўразійскіх даследаванняў	3 гады	
Прафесар кафедры еўразійскіх даследаванняў	3 гады	
Загадчык кафедры міжнароднага права	5 гадоў	
Загадчык кафедры комплекснага вывучэння развіцця КНР	4 гады	
Прафесар кафедры міжнароднага турызму	2 гады	
Дацэнт кафедры міжнародных адносін	4 гады	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 5 гадоў.
Дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін	5 гадоў	
Дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін	5 гадоў	
Дацэнт кафедры міжнароднага права	5 гадоў	
Дацэнт кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці	4 гады	
Старшы выкладчык кафедры мытнай справы		Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не меней за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не меней за 5 гадоў.
Старшы выкладчык кафедры мытнай справы		
Старшы выкладчык кафедры мытнай справы		
Старшы выкладчык кафедры ўсходніх моў		
Старшы выкладчык кафедры ўсходніх моў		
Старшы выкладчык кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці		
Старшы выкладчык кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці		
Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы міжнароднай прафесійнай дзейнасці		
Выкладчык кафедры англійскай мовы міжнароднай прафесійнай дзейнасці		Вышэйшая адукацыя, якае адпавядае педагагічнай дзейнасці, ці вышэйшая адукацыя, што адпавядае навучальнаму прадмету (навучальнай дысцыпліне), і перападрыхтоўка па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы.
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; па 21 чэрвеня. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; па 20 ліпеня.		

*(дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

Хімічны факультэт

Назва пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду*	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій	1 год	Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 7 гадоў.
Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 5 гадоў.
Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій	1 год	
Дацэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі	2 гады	
Старшы выкладчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій		Вышэйшая адукацыя, наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не меней за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не меней за 5 гадоў.
Старшы выкладчык кафедры аналітычнай хіміі		
Старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі		
Старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі		
Старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі		
Асістэнт кафедры фізічнай хіміі		Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не меней за 1 год.
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 7, каб. 423; па 21 чэрвеня. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул Ленінградская, 14, каб. 203; па 20 ліпеня.		

Фізічны факультэт

Назва пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду*	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Загадчык кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 7 гадоў.
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; па 21 чэрвеня. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; па 20 ліпеня.		

Гістарычны факультэт

Назва пасады і кафедры	Тэрмін абрання на пасаду*	Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі
Дацэнт кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў	1 год	Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень кандыдата ці доктара навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 5 гадоў.
Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу	5 гадоў	
Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Мендзялеева, 36, каб. 103; па 21 чэрвеня. Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Мендзялеева, 36, каб. 306; па 20 ліпеня.		

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ

АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі фізіка-хіміі палімерных матэрыялаў і прыродных арганічных злучэнняў па спецыяльнасці радыёфізіка 01.04.03 – 1.

Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб’явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, аддзел кадраў (каб. 230).

Тэлефон аддзела кадраў 270-48-43.

ВІНШУЕМ!

Вынікі Міжнароднага форуму моладзевых і студэнцкіх хароў «Папараць-кветка БДУ»

«Найлепшы хор форуму» – народная студэнцкая харавая капэла БДУ. У намінацыях «найлепшы дырыжор форуму» і «найлепшы твор форуму» перамогу атрымалі кіраўнікі капэлы Аляксандр і Вольга Мінянковы з кампазіцыяй «Слёзы зямлі».

Прыз за найлепшае выкананне духоўнай праграмы атрымаў камерны хор Санкт-Пецярбургскага політэхнічнага ўніверсітэта Пятра Вялікага. У катэгорыі «найлепшае выкананне свецкай праграмы» вылучыўся хор «Мантэм» Санкт-Пецярбургскага горнага ўніверсітэта. «Найлепшым салістам форуму» прызнаны прадстаўнік моладзевага камернага хору Giocoso Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Цімур Курбатаў.

Акрамя таго, экспертны савет конкурсу адзначыў удзельнікаў дыпломамі ў спецыяльных намінацыях:

- за найлепшае вакальнае ўвасабленне духоўнага твора і найлепшае выкананне на замежных мовах узнагароды атрымаў змяшаны хор спецыяльнасці «спеў акадэмічны» Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І. Глінкі;
- за найлепшае выкананне рускай народнай песні пераможцам названы камерны хор Санкт-Пецярбургскага політэхнічнага ўніверсітэта Пятра Вялікага;
- самым артыстычным харыстам вызначылі прадстаўніка хору «Мантэм» Санкт-Пецярбургскага горнага ўніверсітэта Айдара Абдуліна;
- за адзінства стылю і арыгінальнасць узнагароджаны моладзевы камерны хор Giocoso Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

Арганізатарам форуму выступіла ўпраўленне па справах культуры БДУ. У гэтым годзе творчасць прадставілі шэсць калектываў з Беларусі і Расіі. Цырымонія ўзнагароджання ўдзельнікаў адбылася 13 мая на заключным гала-канцэрце ў к/з «Верхні горад».

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 23.05.2023 г.
Зак. 419. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Дар’я Аляксандраўна ПАЎЛЮЧУК
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by